***Шаноўныя чытачы!***
***Паважаныя сябры,***
***калегі-навукоўцы!***

Вы трымаеце ў руках юбілейны нумар навукова-метадычнага часопіса «Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў». За 10 гадоў існавання ў часопісе былі прадстаўлены працы многіх навукоўцаў, імёны якіх па праву называюць сярод эліты беларускай навукі і культуры. У сувязі са значнай падзеяй рэдакцыйны савет вырашыў зрабіць юбілейны «Веснік» адметным і звярнуўся да нашых пастаянных аўтараў з прапановай падрыхтаваць матэрыял для гэтага нумара. Кожны мог выбраць актуальную і важную тэму, якая хвалюе навуковую супольнасць у сучасны момант. Шчыра дзякуем усім, хто адгукнуўся на нашу просьбу.

Спадзяёмся, што ў разнапланавых публікацыях «Весніка» кожны чытач знойдзе цікавае для сябе як у разуменні сучасных тэндэнцый развіцця тэорыі і гісторыі культуры, мастацтва, тэорыі, методыкі і арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці, бібліятэказнаўства, кнігазнаўства, бібліяграфіі і музеязнаўства, так і ў вырашэнні практычных пытанняў.

На працягу 10 гадоў часопіс змяшчае матэрыялы вядучых навукоўцаў нашага ўніверсітэта і краіны, знаёміць чытачоў з важнейшымі навуковымі дасягненнямі і тым самым садзейнічае і ўносіць свой уклад у развіццё айчыннай навукі ў галіне нацыянальнай культуры і мастацтва. На яго старонках шырока асвячаюцца тэарэтычныя праблемы, без вырашэння якіх немагчыма дакладная практыка.

Мяркуючы аб напрамках развіцця часопіса, мы імкнуліся да актуальнасці і навізны тэматыкі, спалучэння навукі і практыкі, пошуку новых рашэнняў, умення своечасова заўважыць перспектыўнае і захаваць пераемнасць навуковых і культурных традыцый, што і ставяць сваёй задачай нашы аўтары і супрацоўнікі рэдакцыі часопіса, усе, хто прымае ўдзел у яго стварэнні.

Часопіс – надзейны памочнік у навуковай дзейнасці аспірантаў, спрыяе станаўленню новых пакаленняў спецыялістаў сферы культуры, дае магчымасць навукоўцам і выкладчыкам іншых устаноў выказаць свае меркаванні аб лёсе беларускіх культурных традыцый. «Веснік» пастаянна пашырае кола сваіх чытачоў, нязменна прыцягвае новыя творчыя сілы. Нашы аўтары – таксама калегі з іншых краін і навукоўцы розных ВНУ. Мы ўпэўнены, што часопіс будзе садзейнічаць далейшаму ўмацаванню культурнага і навуковага супрацоўніцтва, духоўнаму ўзаемаўзбагачэнню.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Юбілейны часопіс атрымаўся дастаткова тэматычна насычаным.

Увагу як навукоўцаў, так і ўсіх цікаўных да гісторыі сваёй зямлі выкліча артыкул доктара гістарычных навук М. А. Бяспалай – у люстэрку навуковай рэтраспектывы паўстаюць абрысы сацыякультурнага жыцця губернскага Мінска. Працэс інтэрферэнцыі ў культуралогіі аналізуе прафесар А. І. Смолік. Феномен семіятызацыі быцця культурай постмадэрну разглядаецца ў артыкуле доктара філасофскіх навук М. А. Мажэйка. Сучасныя тэндэнцыі і неабходнасць выпрацоўкі кампаратыўнага аналізу – актуальная праблема артыкула доктара мастацтвазнаўства В. П. Пракапцовай.

Цікавымі падаюцца тэмы артыкулаў маладых навукоўцаў Т. М. Бабіч, І. М. Макаранкі, Ю. А. Пераверзевай, А. М. Шаройка.

Актуальныя і іншыя матэрыялы «Весніка», да прыкладу, даследаванні антрапалогіі памежжа – М. Н. Бяспамятных, прынцыпы функцыянавання сацыякультурнай адукацыйнай прасторы развіцця асобы ў сучасным інфармацыйным грамадстве – С. Б. Майсяйчук, праблема фарміравання экалагічнай культуры асобы – Н. У. Самерсава, лёс духавога мастацтва – А. Л. Карацееў, сучасны стан айчыннага ансамблевага народна-інструментальнага выканальніцтва – доктар мастацтвазнаўства Н. П. Яканюк, праблемы існавання музеяў у сетцы Інтэрнэт – дырэктар Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка Т. А. Джумантаева, музейны менеджмент і маркетынг, музейная камунікацыя – прафесар А. А. Гужалоўскі, укараненне электронных інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк, інфарматызацыя бібліятэчнай справы – дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Р. С. Матульскі, пытанні бесперапыннай адукацыі – прафесар В. Е. Лявончыкаў.

Думаецца, што ўзнятыя навукоўцамі праблемы адлюстроўваюць прыярытэтныя задачы фундаментальнага і прыкладнога характару, пазначаныя Дзяржаўнай праграмай «Культура Беларусі» на 2011–2015 гг.

10-гадовае творчае жыццё – сведчанне правільнай стратэгіі кіраўніцтва і высокага прафесіяналізму аўтараў і радавых супрацоўнікаў нашага перыядычнага выдання, якіх мы шчыра віншуем са знамянальнай падзеяй. Жадаем паспяховага развіцця, новых адкрыццяў і дасягненняў!

*Старшыня рэдакцыйнага савета, рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў* ***Б. У. Святлоў***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ